«Абитуриентам следует внимательно прочитать памятку на оборотной стороне пропуска, а также разобраться с местом проведения того или иного теста. В Солигорске для проведения ЦТ будут задействованы СШ №11, СШ №10 и гимназия №2. Особенно внимательными в связи с этим надо быть иногородним абитуриентам, а таких порядка 50%», – советует Светлана Вылегжанина.

ГРАФИК ЦТ

- **Белорусский язык** - 14 июня (суббота);
- **Русский язык** - 15 июня (воскресенье);
- **Обществоведение** - 17 июня (вторник);
- **Биология** - 19 июня (четверг);
- **Математика** - 20 июня (пятница);
- **История Беларуси** - 22 июня (воскресенье);
- **Химия** - 23 июня (понедельник);
- **Физика** - 24 июня (вторник);
- **Всемирная история новейшего времени** - 25 июня (среда);
- **Иностранный язык** (английский, немецкий, французский, испанский) - 27 июня (пятница);
- **География** - 28 июня (суббота).


На бюджет можно поступать два раза

Министерство образования утвердило два набора минимальных баллов, которые нужно набрать на ЦТ, чтобы иметь право подавать документы в приёмную комиссию вуза.

Первый – для всех вузов и всех абитуриентов. В нём такие же минимальные баллы, как и в прошлом году. 10 баллов – по белорусскому или русскому языку, 15 – по математике, физике, химии и биологии, 20 баллов – по истории Беларуси, всемирной истории, обществоведению, географии и иностранным языкам.

Второй набор – для тех абитуриентов, которые будут участвовать в конкурсе на места, которые останутся вакантными после зачисления на бюджет. В прошлом году в основном недобрали студентов педагогические, сельскохозяйственные и военные вузы. Чтобы претендовать на эти места, достаточно иметь на ЦТ самые низшие проходные баллы: 5 баллов – по белорусскому или русскому языку, 10 баллов – по математике, физике, химии и биологии и 15 баллов – по истории Беларуси, всемирной истории, обществоведению, географии и иностранным языкам.

Схема, которая поможет сориентироваться абитуриентам и их родителям



ВНИМАНИЕ! Для подстраховки уточняйте все важные даты для абитуриента в приёмных комиссиях вуза!

Успамін пра

На працягу ўжо доўгага часу наша цікавасць была скіравана да фабрыкі мастацкіх вырабаў, якая мела рэканструкцыю і дзе ўжо распачаты выпуск аналагаў славутых слуцкіх паясоў. Нагадаем, што слуцкія паясы – гэта прадметы магнацкага адзення XVIII – XIX стагоддзяў, выдатныя творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва эпохі беларускага барока.



ІНІЦЫЯТАР. Наладзіць у Слуцку выпуск шаўковых паясоў вырашыў князь Геранім Фларыян Радзівіл (1715-1760). Па яго загадзе ў 1756 годзе ў Новым горадзе, паміж радзівілаўскім садам і езуіцкім Троіцкім кляштарам, пачалося будаўніцтва драўляных карпусоў буйнай мануфактуры. Завяршылі комплекс да 1760 года. Аднак у тым жа годзе князь памёр. *Мастак: Якуб Весель.*

Ігар Ціткоўскі
Слуцк

Мы ж зробім экскурс у гісторыю, старонкі якой пазначаны памяццю пра творы, якія прынеслі славу нашаму гораду.

Гісторыя з паясамі

Поясам чалавек карыстаецца спрадвеку. Яго функцыя – прытрымліваць адзенне, каб было зручней працаваць, паляваць або ваяваць, а таксама захоўваць цяпло цела.

Да пояса чапляліся неабходныя дробныя прадметы (огніва, кашэль), за пояс можна было засунуць сякеру, нож. Падчас падарожжаў у паясы хавалі грошы. Рабіліся яны з розных матэрыялаў: з паласы скуры жывёлы, віліся з вяровак, ткаліся, пляліся.

У першабытны час паясам, як і іншым прыладам, якімі карысталіся, акрамя функцыянальнага, надавалі значэнне магічнае. Цела чалавека пояс дзяліў на дзве часткі: верхнюю, што далучалася да неба, і ніжнюю, што сутыкалася з зямлёй.

Разам з такімі дэталямі адзення, што стаялі «на мяжы» з «іншым» асяроддзем, як каўнеры, рукавы, падолы спадніц, кашуль, фартухоў, паясы аздабляліся выявамі магічнага, засцерагальнага значэння. Сэнс многіх з такіх выяў да нашых часоў згубіўся. Як правіла, цяпер яны выкарыстоўваюцца ў традыцыйных народных строях як дэкор у выглядзе арнаменту.

Акрамя функцыянальнага і магічнага, паясы набывалі і значэнне сімвалічнае. Колеры паясоў, напрыклад, і цяпер сімвалізуюць ступень дасканаласці ва ўсходніх адзінаборствах, тое значэнне мае і чэмпіёнскі пояс у прафесійным боксе. Здабыць такі пояс – справа гонару.

З антычнай міфалогіі вядома пра дзявяты з дванаццаці подзвігаў Геракла, калі ён здабыў пояс царыцы амазонак Іпаліты, які сімвалізаваў яе ўладу над усімі амазонкамі.

У падзеленым на класы і адпаведныя групы грамадстве паясы сталі таксама прыкметай прыналежнасці да пэўнай касты, саслоўя. Напрыклад, манахі каталіцкіх жабрацкіх ордэнаў падпярэзваліся грубымі вяроўкамі.

Прывілеяваныя асобы карысталіся шыкоўнымі дарагімі паясамі, яны перадаваліся ў спадчыну нашчадкам і маглі станавіцца для адных прадметам гонару, а для іншых – зайздрасці.

У старажытнарускім летапісе занатаваны выпадак, калі прычынай раздору і абвастрэння ўсобіцы на Русі стаў пояс. На вяселлі маскоўскага Вялікага князя Васіля II у 1433 годзе яго маці Вялікая княгіня Софья сарвала пояс з запрошанага сваяка князя Васіля Касога, бо ён некалі павінен быў належыць іх продку Дзмітрыю Данскому і ў спадчыну перайсці да князя маскоўскага. Соф'я – дачка Вялікага князя літоўскага Вітаўта, а ў сваю чаргу яе дачка Настасся (сястра Васіля II) стала жонкай слуцкага князя Аляксандра Алелькі. У барацьбе паміж нашчадкамі Івана Каліты, падчас якой Васіль II быў асляплены, з-за чаго атрымаў прозвішча «Цёмны», апошняга падтрымліваў і князь Алелька.

Варыянтам арыстакратычнага пояса былі паясы рыцарскія. Многія памятаюць нядаўнюю гісторыю з унікальнай археалагічнай знаходкай – рыцарскім поясам Вітаўта.

Да пачатку XX стагоддзя ў слуцкай Юр'еўскай царкве захоўваўся рыцарскі пояс, які паданне прыпісвала князю Альгерду. Род князёў Слуцкіх ішоў ад Альгерда, несумненна, што і ахвяраваў царкве гэты рарытэт нехта з князёў Алелькавічаў. На жаль, дзе ён цяпер, невядома.

Пояс трывала ўвайшоў у абіход. Выйсці да людзей без пояса азначала выказваць ім непавагу. І цяпер тых, хто паводзіць сябе непрыстойна, называюць распаясаўшыміся. А адабраць пояс азначала пазбавіць гонару і нанесці абразу.

Пра літоўскіх сарматаў

З XVII стагоддзя ў Еўропе, дзе заканадаўцай моды паступова станавілася Францыя, пачалі пашырацца касцюмы новага ўзору – камзолы, фракі, новыя вайсковыя мундзіры, у якіх паясы ўжо не мелі той ролі, або прымяняліся іх варыянты: рамяні, хлясцікі. Такі касцюм сустракаем у Англіі, Галандыі, Прусіі, Аўстрыі. У Расіі новы касцюм увёў цар Пётр I пасля свайго падарожжа ў Еўропу.

Аднак магнатэрыя Літвы і Польшчы ў тыя часы трымалася старых традыцый. Да таго ж у Рэчы Паспалітай у XVII-XVIII стагоддзях пашыралася і стала папулярнай тэорыя сарматызму.

У адпаведнасці з гэтай ненавуковай тэорыяй шляхта і магнаты краіны разглядаліся як нашчадкі старажытнага ваяўнічага племені сарматаў. Быццам бы некалі яны прыйшлі на нашы землі і падпарадкавалі мясцовыя плямёны, ператварыўшы іх у сялян.


У асяроддзі магнатэрыі выпрацоўвалася своеасаблівая сармацкая (рыцарская) культура, пашыраўся сармацкі (шляхецкі) гонар. У мастацтве папулярным стаў варыянт параднага партрэта, які называюць сармацкім.

Адсутнасць інфармацыі пра рэальных сарматаў кампенсавалася звесткамі пра іншыя ўсходнія народы: індыйцаў, персаў, туркаў. У моду пачало ўваходзіць перайманне з усходняй культуры. Радзівілы, напрыклад, у склад сваіх войскаў уводзілі янычарскія роты, арганізоўвалі янычарскія аркестры з адпаведным адзеннем і аксесуарамі (у якасці янычараў, як правіла, выступалі мясцовыя салдаты і музыканты).

Папулярнымі сталі элементы ўсходняга адзення, у тым ліку шаўковыя паясы, якія прывозіліся з Кітая, Індыі, Персіі, Турцыі.

На гэтым, заснаваным на цікаўнасці да Усходу, фоне, князі Радзівілы – слуцкі Геранім Фларыян і яго старэйшы нясвіжскі брат Міхаіл Казімір – вырашылі, як цяпер кажуць, рэалізаваць бізнес-праект: арганізаваць вытворчасць у сваіх уладаннях шаўковых паясоў наўзор усходніх.

Яны ведалі, што ў горадзе Станіславе (цяпер Івана-Франкоўск ва Украіне), працуе выдатны ткач, эмігрант з Турцыі Аванэс Маджаранц, таму паслалі да яго па навуку сваіх майстроў. А ў 1758 годзе Міхаіл Казімір запрасіў Маджаранца, які славіўся як майстар тканін польскіх, турэцкіх і кітайскіх, у Нясвіж, дзе той узначаліў невялікую ткацкую майстэрню, дзе пачалі выраблягца і паясы.



НА ПЛАНЕ ГОРАДА. Слуцкая персіярня, дзе выраблялісе знакамітыя паясы, размяшчалася на вуліцы Сенатарскай (цяпер вуліца Камсамольская). Яна займала ўчастак, на якім зараз знаходзіцца завод «Эмальпосуд». На фрагменце плана XVIII ст. комплекс будынкаў персіярні пазначаны лічбамі 7 і 9.

Памкненні Гераніма Фларыяна

Адзначым, што ткацтва на Случчыне развівалася здаўна. У XVIII стагоддзі ў горадзе дзейнічалі некалькі ткацкіх майстэрняў, на адной з якіх, дарэчы, выраблялі і шаўковыя паясы. Таму некаторыя цяперашнія даведнікі прыводзяць як пачатак вырабу слуцкіх паясоў 1730-я гады.

Тады край належыў Нойбургам – нашчадкам Людвікі Караліны Радзівіл-Нойбургскай, дачкі слуцкага князя Багуслава Радзівіла.

Яны былі іншаземцамі, жылі ў Германіі, з-за чаго іх правы на край ставілася пад сумненне, а за Случчыну змагаліся нясвіжскія Радзівілы і іншыя магнаты. Перамаглі Радзівілы, і з 1744 года ўладаром Слуцкага княства стаў Геранім Фларыян.

Асоба гэта арыгінальная і супярэчлівая. Быў ён вельмі багаты і жорсткі. У сваіх пачынаннях імкнуўся дасягнуць вышэйшага ўзроўню. Марыў нават стаць каралём Рэчы Паспалітай. Яго войска, у прыватнасці артылерыя, не саступала каралеўскаму. Хацеў паставіць сабе ў Слуцку конны манумент, і калі б ідэя была рэалізавана, гэта была б першая конная статуя ў нашай краіне.

І вось ён вырашыў у Слуцку заснаваць буйную мануфактуру і наладзіць выпуск шаўковых паясоў. Па яго загадзе ў 1756 годзе ў Новым горадзе, паміж рэгулярным радзівілаўскім садам і езуіцкім Троіцкім кляштарам, для яе былі выдзелены пляц у 2,4 гектары і пачалося будаўніцтва драўляных вытворчых і жылых карпусоў. Завяршылі комплекс да 1760 г. Аднак у тым жа годзе слуцкі князь памёр бяздзетным, яго ўладанні перайшлі да брата Міхаіла Казіміра.

Маджарскія і Радзівілы

Нясвіжскі князь вырашыў скарыстаць падрыхтаваную ў Слуцку вытворчую базу. Ён не толькі размясціў там слуцкіх майстроў, але і перавёў з Нясвіжа сваіх ткачоў, утварыўшы адзіны калектыў. Кіраваць ім даручыў Маджаранцу, якога тады ўжо звалі Янам Маджарскім.

У комплекс фабрыкі шаўковых паясоў уваходзілі два выцягнутыя ў даўжыню паралельныя адзін аднаму карпусы. У адным з іх, які быў двухпавярховым, меліся два вялікія вытворчыя памяшканні і пяць меншых, а таксама сталярная майстэрня і месца для адміністрацыі.

Меліся таксама і дадатковыя збудаванні, у тым ліку казармы з адзінаццаццю пакоямі, дзе жылі майстры і працаўнікі фабрыкі,

слуцкую персіярню



ЗАСНАВАЛЬНІК. Справу працягнуў брат Геранiма Радзівіла нясвіжскі князь Міхаіл Казімір Радзівіл па прозвішчы Рыбанька (1702-1762), якому перайшла Случчына. Ён вырашыў скарыстаць падрыхтаваную базу і заснаваць вытворчасць паясоў у Слуцку. Ён не толькі размясціў у казармах фабрыкі слуцкіх майстроў, але і перавёў з Нясвіжа сваіх ткачоў. *Невядомы мастак сярэдзіны XVIII ст.*

амбар, стайня, калодзезь.

Хоць вытворчасць паясоў у Слуцку вядома з 1730-х гадоў, ды і ў Нясвіжы, як бачым, яны ўжо ткаліся, тым не менш афіцыйнай датай пачатку дзейнасці Слуцкай радзівілаўскай фабрыкі шаўковых паясоў лічыцца 1760 год.

Установу называлі персіярняй, бо спачатку за ўзор браліся персідскія паясы (рабілі і такія, якія называлі французскімі, парыжскімі і кітайскімі). А слава яе заснавальніка дасталася князю Міхаілу V Казіміру Радзівілу, які ў гісторыі вядомы пад мянушкай Рыбанька.

Міхаіл Казімір перажыў свайго слуцкага брата на два гады. З 1762 года гаспадаром Нясвіжа і Случчыны стаў яго сын Караль Станіслаў.

Караль Станіслаў быў адчайны авантурыст і патрыёт, сапраўдны «сармат». Ён любіў напаказ выказваць павагу і любоў да сваёй шляхты, за што і яго празвалі «Пане Каханку». Палітычныя хістанні гэтага князя прымусілі яго пэўны час жыць за мяжой. Яну Маджарскаму з ім як гаспадаром персіярні прыходзілася перапісвацца. Урэшце з князем у 1776 годзе была заключана дамова, Маджарскі стаў арандатарам фабрыкі.

Князь праславіўся як невераґодны марнатраўца. Ён з лёгкасцю разбазарваў свае грошы, таму браў пазыкі, у тым ліку і ў Маджарскіх.

У Слуцк Ян Маджарскі прыбыў з жонкай і сынам Лявонам. Неўзабаве Радзівіл вылучыў ім для пражывання фальварак Сёлкі – пасяленне за горадам, на паўдарозе да Лучнікоў. Цяпер гэта гарадскі квартал у раёне металааб'яднання. Пазней у іх трыманні аказаўся і фальварак Івань.

Кіраваў персіярняй Ян прыкладна да 1778-80 гадоў, потым арандатарам стаў яго сын Лявон. Менавіта пры ім персіярня дасягнула росквіту, а слуцкі пояс набыў свой класічны выгляд. Быў ён, як правіла, двухбаковы, двух- або чатырохліцавы, з шыкоўнымі арнаментаванымі канцамі, да якіх прышываліся махры. Паясы, у якіх акрамя шаўковых прымяняліся залатыя або сярэбраныя ніці, называліся літымі.

Заслугі Лявона ў справе арганізацыі дзейнасці персіярні былі адзначаны ўрадам, і яму ў 1790 годзе надалі шляхецкае званне.

У 1790 годзе Случчына перайшла ў спадчыну пляменніку Караля Станіслава князю Дамініку. Пасля падзелу Рэчы Паспалітай ён знаходзіўся пры двары рускага цара, аднак у сувязі з тым, што Напалеон абяцаў адрадзіць Рэч Паспалітую, перайшоў да яго і прыняў удзел у вайне 1812 года на баку французаў. Загінуў у 1813 годзе. Пасля смерці Дамініка Радзівіла Слуцк застаўся яго дачцы Стэфаніі.

Пасля далучэння нашага краю да Расійскай імперыі дзейнасць слуцкай персіярні пачала занепадаць. З Расіі на адзенне прыйшла новая мода, у якой пояс ужо не меў таго месца як раней. А нашэнне старога касцюма з поясам разглядалася як дэманстрацыя апазіцыйных настрояў адносна новай улады. Пасля паўстання 1831 года нашэнне старога касцюма ўвогуле было забаронена.

Лявон Маджарскі ў 1795 годзе вырашыў адмовіцца ад арэнды, аднак канчаткова дамову з Радзівіламі скасаваў у 1807 годзе. Кіраўніком персіярні стаў адзін з лепшых ткачоў, вучань Яна Маджарскага Юзаф Барсук.

Сям'я Маджарскіх з Сёлак перамясціліся ў маёнтак Манькаў. Лявон жыў да 1811 года, быў пахаваны на бернардзінскім некропалі ў Слуцку (цяпер тэрыторыя маслабазы). Магчыма, што там пахаваны і яго бацька.

У Лявона былі сыны Антон і Ян, аднак ні яны, ні іх дзеці ткацтвам не займаліся. Па мужчынскай лініі род неўзабаве згас, дзяўчаты выходзілі замуж і мянялі прозвішчы. Напрыклад, унучка Лявона Альжбета выйшла замуж за ўбельскага шляхціца Часлава Манюшку. У іх нарадзіўся сын Станіслаў, які стаў вядомым музыкантам і кампазітарам.

Эпілог

Колькасць заказаў на паясы паступова змяншалася (хаця акрамя іх выпускаліся і іншыя тканіны), змяншалася і колькасць работнікаў.

Напрыклад, напрыканцы XVIII стагоддзя дзейнічала ад 25 да 28 варштатаў, за якімі працавала больш за паўсотні работнікаў, а на пачатку XIX стагоддзя іх засталося 12. У 1828 годзе на фабрыцы працавалі толькі адзін майстар і адзін падмайстар, мелася чатыры варштаты, з якіх у рабоце быў адзін.

У 1844 годзе фабрыку паясоў рашылі закрыць. Цалкам вытворчасць тут спынілася ў 1846 годзе. Гэта быў час, калі Слуцк з уласнасці Льва Вітгенштэйна (яго жонкі Стэфаніі ўжо не было) перайшоў у дзяржаўную казну.

Жылы корпус персіярні на планах Слуцка пачатку XIX стагоддзя абазначаўся як палац князёў Радзівілаў. Як сведчыць слуцкі гарадніцы барон Сталь, на працягу 1815 – 1830-х гадоў у ім размяшчаліся кватэры начальнікаў палкоў, што знаходзіліся ў горадзе і павеце.

Спачатку гэта быў Літоўскі уланскі полк, пазней на змену яму з'явіўся Польскі уланскі полк. Дзейнічалі палкі пад верхавенствам брата рускага цара Вялікага князя Канстанціна. Тут, на кватэры начальніка палка, летам 1825 года на ноч спыняўся рускі цар Аляксандр I, калі ехаў з Пецярбурга ў Крым.

У вытворчых памяшканнях станкі заставаліся да канца 1850-х гадоў. Без дагляду яны прыходзілі ў заняпад.

Пляц з будынкамі былой персіярні Леў Вітгенштэйн яшчэ ў 1836 годзе падарыў свайму ўрачу Аляксандру Мацкевічу. У яго крыху пазней гэты пляц выкупіў мясцовы ўрач Юльян Рамашка.

Пасля яго палова маёмасці была набыта слуцкім ўрачом Канстанцінам Францкевічам, а на другой палове пляца размясцілася гарадское аддзяленне Расійскага грамадства міласэрнасці і Земская ўправа.

У Грамадзянскую вайну два дамы Земскай управы з яшчэ некалькімі пабудовамі згарэлі ў жніўні 1920 года падчас пажару, які ўчынілі адступаючыя з горада польскія войскі.

Пасля ўсталявання Савецкай улады, з 1923 года, будынкі, якія засталіся на месцы былой персіярні, былі прыстасаваны для размяшчэння рамесных майстэрняў бляхароў і кавалёў.

У 1930-я гады там былі ўзведзены новыя ліцейны і механічны цэхі, а майстэрні рэарганізаваны ў Слуцкі чыгуна-ліцейны механічны завод. Цяпер гэта завод «Эмальпосуд» – адзін з галоўных аб'ектаў на вуліцы Камсамольскай.

Сама вуліца Камсамольская таксама мае цікавую гісторыю. Ад пачатку гэта была не проста вуліца, а бульвар. Заснаваў яго ў сярэдзіне XVII стагоддзя слуцкі князь Багуслаў Радзівіл паўзор бульвараў, якія ў тыя часы стваралі еўрапейскія манархі ў сваіх сталіцах. Ён стаў першым бульварам у нашай краіне.

У розныя часы слуцкі бульвар меў назвы: вуліца Шырокая, вуліца Сенатараская, цяпер – Камсамольская. Гэта адзіны «аўтэнтычны» помнік, які захаваўся да нашага часу і «памятае» радзівілаўскую персіярню з яе выдатнымі майстрамі і вяльможнымі заказчыкамі. ●

Уладары слуцкай персіярні



Князь Караль Станіслаў Радзівіл па прозвішчы Пане Каханку (1734-1790). *Невядомы мастак 2-й паловы XVIII ст.*



Князь Дамінік Радзівіл (1786-1813). *Невядомы мастак 1-й трэці XIX ст. (фрагмент)*



Княгіня Стэфанія Радзівіл (1809-1832). *Невядомы мастак XIX ст. (фрагмент)*



Князь Леў Пятровіч Вітгенштэйн (1799-1866). *Мастак Ф.Кругер 1836 г. (фрагмент).*

ЖЫЦЦЁВАЯ ГІСТОРЫЯ

Піліпаўская туга

Уладзімір Дамель
Салігорск


Малюнак: Вера Шут

Што стала рабіцца ў яе душы, Марына Міхайлаўна сама сабе не магла растлумачыць. Калі ў светлы дзень яшчэ неяк цярпелася, то з наступленнем вечара яна гатова была бегчы невядома куды, бо заставацца адной у трохпакаёвай кватэры станавілася страшна. Тады навальвалася невядома адкуль жалоба, якая застаўляла яе плакаць. Яна плакала, не разумеючы, ад чаго і па чым плача.

У доўгія ночы перабірала ў памяці сваё жыццё. Муж чамусьці не вытрымаў сямейнага жыцця і дзесяці гадоў, пакінуў яе з дзвюма малымі дачушкамі. Гонар за сябе – не горшая за другую – застаўляў працаваць за дваіх. Дачушкі выраслі, свае сем'і, жывуць у другой дзяржаве, прыязджаюць рэдка.

Неяк з работы прапанавалі пуцёўку ў мясцовы прафілакторый. Амаль штовечар танцы, а яна не стаяла пад сцяной, калі грала музыка, заўсёды запрашалі мужчыны на танец. У адным танцы пазнаёмілася з мужчынам са свайго горада. І ўсе астатнія дні ў прафілакторыі праляцелі весела.

Ён часта забягаў да яе, тэлефанаваў. А калі пра сустрэчы з ёю стала вядома яго жонцы, яна адказала ёй з гонарам: «Забяры, прывяжы да сваёй спадніцы». Часта думала, ці правільна робіць, дазваляючы сабе гэтыя сустрэчы. «А тая дазволіла, забрала», – адказвала сабе і сумленне супакойвалася.

Гэтак цягнулася не адзін год. Неяк прыходзіць ён да яе засмучаны, сеў ля стала не распранаючыся і кажа: «Жонка мая цяжка хворая». «Выздаравее, з жанчынамі бывае гэта», – смяючыся, адказала яна. Але ён падняўся і пайшоў. А хутка яго жонка памерла.

Доўга з ім яна не сустракалася. Стала шукаць сустрэчу. Для гэтага хадзіла ў той магазін, што быў побач з яго домам. Разлік быў правільны. Сустрэла яго пры выхадзе з магазіна з торбаю ў руках. «Прыходзь палуднаваць. Мо кормішся ў сухамятку?» – пыталася. Ён стаяў, апусціўшы галаву. «Схуднеў. Адзін жывеш? Прыходзь».

У поўдзень патэлефанавала, што абедаць прыгатавана. З гэтага дня ён зноў стаў заходзіць, але нешта яго стрымлівала ў адносінах да яе. Неяк прапанавала застацца на ноч, ён адказаўся: «Будзе тэлефанаваць дачка».

Так цягнуліся дні, годы. Не раз пытала сябе: «Хто ён мне? Муж? – Не, не муж! Гасцявы любоўнік!» Ад прыдуманага стала смешна.

Гасцявы любоўнік прыходзіў рэдка. Стаў з вудай хадзіць на водасховішча. Часам прыносіў улоў да яе. Тады разам гатавалі юшку. Гэтыя прыходы радавалі. Яна станавілася спакойнай і задаволенай: ёсць аб кім клапаціцца. Не раз прапанавала яму перайсці да яе, але гасцявы любоўнік аднекваўся, вяртаўся ў сваю кватэру.

Яго смерць для яе была нечаканай. Чаму пасля смерці жанчыну апанавала цяжкая туга? Хадзіла па вуліцах горада, часам сустракаліся знаёмыя. Тыя хваліліся сваімі ўнукамі, ёй хваліцца не было чым. Вярталася да сабе ў кватэру, станавілася тужліва, пачынала плакаць.

Чым ночы станавіліся даўжэйшымі, тым больш было нудна і цяжка. Гэта Піліпаўка, а ў Піліпаўку воўк нема вые. Не, выць яна не будзе. Ранкам пайшла ў прафілакторый прасіць пуцёўку.

Чатыры з паловай мільёны плаціце і, калі ласка, прыходзьце. Пакуль праходзіла медыцынскі агляд, туга некуды прападала.

Але ў прафілакторыі не было таго, што раней. Маладзейшыя яе абходзілі, а равеснікаў мужчын было няшмат. І тыя вечарамі кучкаваліся і пілі гарэлку. Прабыла чатырнаццаць дзён і вярнулася ў сваю кватэру. Пужалася прыходу ночы, такой страшнай стала адзінота. Хоць Піліпаўка прайшла, але туга не знікала.

Зазваніў тэлефон. Здзіўлена, хто б мог у позні час тэлефанаваць, пайшла да тэлефона. «Прабач, што позна, – гаварыла яе былая аднакурсніца, якая жыла ў вёсцы. – Піліпаўская туга не дае супакою. Дажыць бы хутчэй да вясны. У хаце сем градусаў цяпла, страшна схадзіць у хлеў па дровы».

Марына Міхайлаўна не чула, аб чым далей гаварыла яе знаёмая, але бачыла занесены снегам двор, а там за агародам цёмны лес.

«Заўтра да поўдню каб была гатова да ад'езду. Я прыеду па цябе на таксі, зіму будзем тужыць разам. Усё вырашана, не аднеквайся», – адказала яна і паклала трубку.

У гэтую ноч упершыню спала спакойна. Заўтра забярэ да сябе адзінокую жанчыну, будзе аб кім клапаціцца.

ПІШЫЦЕ. Вашы жыццёвыя гісторыі дасылайце на info@kurjer.info або: а/с 53, 223610, Слуцк-9.

ФОТОНОВОСТЬ



Показали провинцию

СЛУЦК. В галерее искусств 7 мая открылась выставка «Лето в провинции». Такое название для неё выбрали неслучайно. «Лето в провинции» – так называется пленэр художников-педагогов, который каждое лето проходит в Смолевичах.

В этом городе они собираются с 2012 года. Инициатором творческих встреч стала Наталья Каминская, руководитель художественного отделения Смолевичской детской школы искусств.

«У преподавателей не хватает времени для собственного творчества, – отметила Наталья Каминская во время открытия выставки в Слуцке. – Ведь немало времени они отдают детям. Именно поэтому у меня появилась идея во время летних каникул организовывать пленэр для педагогов, чтобы они смогли познакомиться друг с другом, обменяться идеями и поработать».

Картины, которые были созданы на пленэрах, можно увидеть в галерее искусств до конца лета. Наталья Каминская отметила: «Здесь красивый зал, наши работы в нём очень хорошо смотрятся». *Фото и текст: Анастасия Орловская*

ВІНШАВАННІ

Шаноўны **УЛАДЗІМІР ВІКТАРАВІЧ АЛІНОЎСКІ!**
З задавальненнем віншуем цябе з юбілейным Днём нараджэння!
Няхай кожны дзень для цябе будзе шчаслівым і прыемным, прыносіць толькі плён і ўдачу! Няхай прысутны табе аптымізм і надалей дапамагае быць жыццярадасным і паспяховым!
Марыя і Сяргей

Паважаны **СЯРГЕЙ ВАЛЯНЦІНАВІЧ АНІКЕЙ!**
З задавальненнем віншую цябе з 50-гадовым Днём нараджэння!
Шчасця табе сямейнага, жыццёвых радасцей, дабра, бадзёрасці і здароўя на доўгія гады! Тваё сяброўства заслугоўвае самых вялікіх і прыемных слоў падзякі!
Твой сябар Уладзімір, в.Балотчыцы

ЕСТЬ ПОВОД ПОЗДРАВИТЬ

«Кур'ер» подсказывает, что в эти дни свой День рождения отмечает:

18 мая – **Мария Михайловна Лебедь**, индивидуальный предприниматель, г.Слуцк

НАШИ ДЕТИ



ЮЛИЯ КРОТ. 13 мая ей исполнилось 13 лет.

Тебе уже 13 лет –
Ты взрослая почти.
А впереди весь белый свет
И добрые пути.
Учись, расти, здоровой будь,
Успехов достигай,
Друзей своих не позабудь,
Родных не обижай!
Пусть улыбается тебе
Счастливая звезда
И будет всё в твоей судьбе
Исполненным всегда!
Мама, бабушка




ТИМОФЕЙ ИВАНЮК. 16 мая ему исполнится 9 лет.


Тимофей – ты наша гордость,
честь тебе, почёт.
Мы сегодня составляем о тебе
отчёт:
Ты силён, хорош собою,
стильный, как с витрин,
И к тому ж умён, конечно,
лидер викторин!
Пожелаем мы сегодня в твой
день именин –
Будь удачлив ты по жизни и
от бед храним.
Желаем быть здоровым и
сильным!!!
Мама, папа, сестричка
София, бабушки, дедушки,
дяди, тёти






ИГРОВАЯ ПЛОЩАДКА

Найди место для каждого квадратика внизу.




Найди 10 отличий.



ВЕСЁЛАЯ ЭНЦИКЛОПЕДИЯ ФРАЗЕОЛОГИЗМОВ



Как известно, кенгуру
Носят в сумке детвору.
С них **пример берут**
соседи
Австралийские медведи –
Добродушные коалы.
Если в сумке тесно стало,
Предлагает мама сыну
Перебраться к ней
на спину.
Медвежонок с мамой
ладит –
Ей **на голову не сядет**.

*** Брать пример** – подражать кому-либо.

Сесть на голову (кому-либо) – постоянно что-то требовать от кого-либо, вести себя бессовестно.

Сидит очень прямо
Гордец-господин –
Как будто сейчас
ПРОГЛОТИЛ он …
(АРШИН)

«Аршин проглотил» – так говорят о человеке, который стоит или сидит неестественно прямо. А «аршин» здесь – это линейка длиной 0,71 м. Такова была старинная русская мера длины.

Сосед наш всю ночь
То стучал, то сверлил –
И ЗВЕРЯ ВО МНЕ
он к утру …
(РАЗБУДИЛ)

«Будить зверя» – злить, приводить в ярость, раздражать кого-либо.



Надвор'е

Прагноз мае папярэдні характар

	Пт	Сб	Нд
Усход -	5.06	5.05	5.03
Заход -	21.07	21.09	21.10
Працягласць дня -	16.01	16.04	16.07

Напрыканцы тыдня суцэльная воблачнасць, у пятніцу ды суботу дажджы, магчымы навальніцы. У нядзелю ападкі не прагназуюцца, але будзе смуга, бачнасць 500-800 м.

	Пятніца 16 мая	Субота 17 мая	Нядзеля 18 мая
t° уначы	+12...+14 °С	+13...+15 °С	+14...+16 °С
t° удзень	+14...+16 °С	+15...+17 °С	+21...+23 °С
вецер	паўночна-ўсходні		паўдн.-усходні
	8-10 м/с	7-9 м/с	3-5 м/с
атм. ціск	763 мм рт.сл.	762 мм рт.сл.	762 мм рт.сл.

Аб надвор'і ў Слуцку на наступныя шэсць дзён магчыма даведацца на сайце «Кур'ера» - kurjer.info



Курсы валют

Дадзеныя на 13.05.2014 г.

Курс абмену валют у «Белаграпрамбанку»

	купля:		продаж:
USD -	9980 руб.	-	10 040 руб.
Euro -	13 740 руб.	-	13 820 руб.
Рубель РФ -	279 руб.	-	289 руб.

Афіцыйны курс Нацыянальнага Банка Беларусі

USD	EURO	Рубель РФ
10 010 руб.	13 780 руб.	284,5 руб.

Курс EURO на 01.05.2014 года - 13 840 руб.

канверсійны курс: USD / EURO - 0,72; EURO / USD -1,37

Штодзённа аб курсе валют на сайце «Кур'ера» - kurjer.info

Базавая велічыня (з 01.04.2014 г.) -	150 000 руб.
Тарыфная стаўка 1 разраду (з 01.05.2014 г.) -	275 000 руб.
Мінімальны заробак (з 01.01.2014 г.) -	1 660 000 руб.
Пагадзінны мінімальны заробак (з 01.01.2014 г.) -	9890 руб.
Бюджэт пражытачнага мінімуму (з 01.05.2014 г.) -	1 212 470 руб.



Цэны і тарыфы тыдня

Дадзеныя на 13.05.2014 г. (у рублях)

Электраэнергія (1кВт.г)

а) дамы без эл.пліт
- да 150 кВт/г **745,9**
- да 300 кВт/г **917,2**
- звыш 300 кВт/г **917,2**

б) дамы з эл.плітамі
- да 250 кВт.г **633,9**
- да 400 кВт.г **824,1**
- звыш 400 кВт.г **917,2**

в) дамы без эл.пліт, гар.вады і прыр.газу
- да 300 кВт.г **745,9**
- звыш 300 кВт.г **917,2**

Газ

1. Прыродны па лічыльніку (1м³)
а) толькі газавая пліта - **1940,9**
б) ацяпляльныя прыборы:
зім. перыяд - **530,3**
лет. перыяд - 1940,9

2. Прыродны без ліч-ка (з 1 чалавека)
а) газавая пліта - **15 500**
б) газавыя пліта і калонка - **44 650**

3. Звадкаваны па лічыльніку (1м³) - **5175,4**

4. Звадкаваны без лічыльніка (1 чал)
а) толькі газавая пліта - **20 700**
б) газ. пліта і гарачае водазабеспяч. - **15 500**
б) газавыя пліта і калонка - **43 950**
Звадкаваны ў балонах - **77 450**

Тэлефонныя размовы
-па горадзе і раёне **22,7**
-па вобласці **60,7**
-па Беларусі **60,7**
-абанплата **8310,0**

Аўтапаліва (1 літр)
- бензін АІ-95 **9500**
- бензін АІ-92 **8800**
- дызпаліва Е5 **9800**
- газ **5700**
у межрайгазе **6000**

Водазабеспячэнне (1м³)
- па лічыльніку **1000,0**
- без ліч. і звыш ліміту **6500,0**

Каналізацыя (1 м³)
- па лічыльніку **650,0**
- без ліч. і звыш ліміту **5250,0**

Інфа-Кур'ер
Адрас рэдакцыі: ПУП «Інфа-Кур'ер». Вул. Камсамольская,1-10. 223610, г. Слуцк. Тэлефон/факс (8 01795) 2 09 04. *Для пісем:* а/с 53. 223610, г. Слуцк-9

Заснавальнік: і галоўны рэдактар Станкевіч Сяргей Дзмітрыевіч

Пасведчанне аб рэгістрацыі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь №20 ад 06.10.2009 г.

Рэдакцыйная калегія: Сяргей Багдашыч, Сяргей Станкевіч, Ігар Ціткоўскі

Заказ № 413
Надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение», Ліц. ЛП № №02330/85 ад 23.01.2014 г.
Адрас друкарні - вул. Каржанеўскага, 14, г. Мінск
Тыраж - 6010 экз. *Аб'ём выдання* - 8 друкаваных аркушаў, 420х600 мм
Падпісана ў друк - 13.05.2014 г. у 15.00

Падпісны індэкс - 64066

